ІНІЦЫЯТЫВА І СУПРАЦОЎНІЦТВА

АДЗІН КРОК ДА БІЗНЕСУ

Рэсурсныя цэнтры адкрыліся ў 12 раёнах краіны ў рамках рэалізацыі праекта «Пашырэнне эканамічных магчымасцяў у сельскай Беларусі»

Тут мясцовыя жыхары могуць атрымаць кансультацыю, як весці свой бізнес, і паўдзельнічаць у трэнінгах. Першыя вынікі работы мы падсумавалі разам з інфармацыйна-асветніцкай установай «Новая Еўразія», якая стала ініцыятарам гэтага праекта. Яго таксама падтрымалі Еўрасаюз і Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID).

Семінар па веларамонце ў Валожынскім раёне

Пытанне — адказ

Тэрыторыі былі выбраны конкурсам. Адзін з крытэрыяў — наладжанае партнёрства паміж мясцовымі ўладамі, жыхарамі, некамерцыйнымі арганізацыямі і бізнесам. Яны павінны бачыць свае праблемы і мець жаданне іх вырашаць. Так, былі выбраны тыя тэрыторыі, у якіх больш дыферэнцаванае партнёрства, якія акрэслілі свае праблемы і вызначылі прыярытэтныя напрамкі дзейнасці па іх вырашэнні. Тузін «шчасліўчыкаў» склаўся з тэрыторый Гродзенскай вобласці (Дзераўноўскага сельсавета Слонімскага раёна, Крэўскага і Залескага сельсаветаў Смаргонскага раёна, Жалудоцкага і Орлеўскага сельсаветаў Шчучынскага раёна), Брэсцкай (Мотальскага сельсавета Іванаўскага раёна, Спораўскага сельсавета Бярозаўскага раёна, Відамлянскага сельсавета Камянецкага раёна і Чарнаўчыцкага сельсавета Брэсцкага раёна), Гомельскай (Чамярыскага сельсавета Брагінскага раёна), Мінскай (Крывасельскага сельсавета Вілейскага раёна, Валожынскага і Пяршайскага сельсаветаў Валожынскага раёна), Магілёўскай (Ходасаўскага сельсавета Мсціслаўскага раёна) і Віцебскай (Бабініцкага і Мазалаўскага сельсаветаў Віцебскага раёна).

Пасля шэрагу даследаванняў для кожнай тэрыторыі была распрацавана стратэгія ўстойлівага развіцця на 5 гадоў. На першым этапе праекта была створана ініцыятыўная група, якая працавала над дэталізацыяй стратэгіі і пастаноўкай пэўных задач. Паралельна пачаліся кансультацыі для мясцовых жыхароў.

— Часцей за ўсё мы тлумачым мясцоваму насельніцтву, як адкрыць уласны бізнес, як аказваць якасныя агратурыстычныя паслугі, — кажа менеджар праектаў «Новай Еўразіі» Людміла БАТУРА. — Як зарэгістраваць сядзібу, дзе ўзяць танны крэдыт на яе адкрыццё, на вядзенне сваёй справы. Вучым, як аптымізаваць уласныя і арганізацыйныя фінансавыя патокі, як спланаваць бюджэт. Пажылым людзям нашы каардынатары дапамагалі адкрыць карткі для атрымання пенсіі ці для іншых сацыяльных выплат. У кожнай з тэрыторый была спланавана свая інфармацыйная і адукацыйная кампанія, якая найбольш поўна адпавядала патрэбам мясцовага насельніцтва. Бягучы этап рэалізацыі праекта — трэнінгавыя кампаніі. Падчас іх жыхары навучацца новай справе ці ўдасканаляць свае веды. Чакаецца, што за год жыхары кожнай з пілотных тэрыторый праекта атрымаюць не менш за 60 гадзін кансультацый знешніх экспертаў, пры дапамозе каардынатараў рэсурсных цэнтраў падрыхтуюць не менш за тры бізнес-планы па адкрыцці ўласнага бізнеса, пад якія потым атрымаюць фінансаванне ў банках, і напішуць не менш за дзве заяўкі на конкурсы міні-грантаў, каб прыцягнуць дадатковыя рэсурсы для развіцця тэрыторый.

Актыўныя напярадзе

План працы каардынатараў рэсурсных цэнтраў фарміруецца ў залежнасці ад патрэб тэрыторыі і пажаданняў мясцовых жыхароў. Так, напрыклад, у Бабініцкім і Мазалаўскім сельсаветах Віцебскага раёна ёсць аграрны каледж, дзе вучыцца шмат моладзі. Там перспектыўна працаваць з юнакамі і дзяўчатамі, наладжваць сувязі паміж імі і мясцовымі фермерамі, каб супрацоўніцтва давала практычны вопыт для моладзі. А на Мсціслаўшчыне Ходасаўскі сельсавет робіць стаўку на адукацыю дзяцей школьнага ўзросту. Падлеткі ўдзельнічаюць у міжнародных конкурсах, займаюць прызавыя месцы на інтэрнэт-алімпіядах.

> “ У некаторых з пілотных сельскіх мясцовасцяў амаль няма зарэгістраваных ІП, адначасова жыхарам часта не хапае вельмі простых паслуг.

Але ёсць напрамкі дзейнасці, актуальныя амаль для ўсіх тэрыторый. Адзін з іх — турызм. Прычым кожная мясцовасць накіравана на розных спажыўцоў. На захадзе краіны чакаюць найперш еўрапейцаў, а Віцебская вобласць арыентавана на расіян. Паступова развіваецца прыгарадны турызм: блізкія да горада сельсаветы чакаюць гараджан у выхадныя на адпачынак на прыродзе.

— Вельмі цікавыя ідэі ўзніклі на тэрыторыях, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, — расказвае Людміла. — Яны робяць стаўку на экстрэмальны турызм. Таму што ёсць людзі, якія хочуць наведаць забруджаную зону. Чаму не даць ім гэтую магчымасць, але зрабіць гэта так, каб было бяспечна? Арганізаваць суправаджэнне, каб вёў іх чалавек, які ведае, куды пайсці, колькі часу можна знаходзіцца на гэтай тэрыторыі. Каб было і цікава, і бяспечна.

Працаваць гатовыя

Сельская гаспадарка з'яўляецца другім па папулярнаці напрамкам дзейнасці ў пілотных тэрыторыях. Жыхары хочуць займацца агародніцтвам, пытаюць у кансультантаў, як больш эфектыўна наладзіць супрацоўніцтва з буйнымі спажыўцамі і аптовымі пакупнікамі. Цікавяцца рознымі відамі кааперацый, напрыклад, па зборы і нарыхтоўцы грыбоў і ягад. У шэрагу населеных пунктаў ёсць нагода сумесна працаваць дзеля таго, каб на тэрыторыі з'явіўся свой брэнд, які можа прадстаўляць мясцовасць як мінімум на ўзроўні рэспублікі.

— Як мы і чакалі, ёсць моцны попыт на дапамогу ў арганізацыі дзейнасці рамеснікаў (асабліва па збыце вырабаў), запыт на павышэнне навыкаў прадпрымальніцкай дзейнасці. У некаторых з пілотных сельскіх мясцовасцяў амаль няма зарэгістраваных ІП, адначасова жыхарам часта не хапае вельмі простых паслуг, якія магчыма арганізаваць на гэтай жа тэрыторыі. У такіх выпадках эксперты будуць расказваць зацікаўленым жыхарам пра тое, як адкрыць уласны бізнес, якія неабходны для гэтага дакументы. Ёсць рэгіёны, дзе хочуць займацца больш «унікальнымі» праектамі, напрыклад, авечкагадоўляй, — працягвае Людміла Батура.

Хацелася б, каб у раёнах было больш інавацыйных ідэй па адкрыцці высокатэхналагічнага бізнесу. Разам з такім бізнесам у тэрыторыі з'явіцца і высококваліфікаваныя спецыялісты. Калі прыязджаюць такія кадры, гэта вялікі «плюс» для раёна: чалавек, акрамя эканамічнага, робіць інтэлектуальны ўклад у развіццё мясцовасці, прывозіць з сабой ідэі, рэсурсы. І гэта цалкам магчыма: бізнесам у сферы інтэрнэт-тэхналогій неабавязкова размяшчацца ў вялікім горадзе. Яны здольныя працаваць дыстанцыйна. Але, на жаль, зусім няшмат праектаў у гэтай сферы.

Каб спрыяць эканамічнаму развіццю, у сельскай мясцовасці можна стварыць свабодную эканамічную зону са спрыяльнымі ўмовамі для бізнесу, інвеставаць у базавую інфраструктуру. Такія прыклады ёсць у Чэхіі, Славакіі, Славеніі, калі маленькі горад — 1500 жыхароў — стварыў свабодную эканамічную зону, куды прыцягнуў буйныя прадпрыемствы, на якіх цяпер працуюць каля 2500 чалавек. Гэта ж «бум» для тэрыторыі! Калі прыязджае вялікая кампанія, побач з ёй ствараецца яшчэ дзясятак новых, мясцовых: жыхары пачынаюць рабіць запчасткі, абслугоўваць вытворчасць. Такім чынам складаюцца кластары па аўтамабілебудаванні. Мясцовыя жыхары аказваюць паслугі па харчаванні, пражыванні людзей, якія працуюць у кластары. Гэта вялікі патэнцыял для развіцця тэрыторыі. Добра было б, калі б, акрамя лакальных праектаў па турызме і сельскай гаспадарцы, у нас з'явіліся б больш глабальныя праекты ў раёнах, якія прыцягвалі б інвестыцыі, новыя ідэі і чалавечы капітал.

Надзея АНІСОВІЧ.

Тэрапія для... душы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Толькі за апошнія тры месяцы ксёндз узяў да сябе чатырох чалавек. Яны абкошвалі траву, прыбіралі ў касцёле. Так бы мовіць, іх выхоўвалі не толькі працоўнай тэрапіяй, але і лячылі душу духоўнымі размовамі.

— Праходзіць час, і людзі пачынаюць асэнсоўваць свае ўчынкі, інакш глядзець на жыццё, — сцвярджае Аляксандр Пілінкевіч.

Сам Аляксандр Іванавіч амаль 13 гадоў адпрацаваў у гэтых мясцінах участковым інспектарам. Ён ведае тут кожнага чалавека і яго праблемы. Мар'ян Карлавіч прыехаў у Налібакі ў 90-х гадах мінулага стагоддзя. Храм стаяў без даху, без купала, можна сказаць, у руінах з 1936 года. Напачатку ўзвялі невялікую капліцу, дзе праходзілі набажэнствы. А затым, у 1994-м, касцёл дабудавалі. Настаяцель прыклаў вельмі шмат сіл, намаганняў, каб адрадзіць святыню. Людзі гэта разумеюць і вельмі ўдзячны святару. Мар'ян Карлавіч таксама добра ведае, чым жывуць яго прыхаджане, што іх турбуе. Яму, як і старшыні сельвыканкама, жыхары давяраюць.

— Атмасфера на гэтай тэрыторыі станоўча ўплывае і на работу сельгаспрадпрыемства. Жывёлагадоўчы комплекс «Налібокі» — адзін з лепшых у раёне па надоях, адкорме жывёлы, — уступае ў размову старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Аркадзь Казякоўскі, які і прывёз мяне ў вёску. — Для таго каб вытворчасць не знізілася, павінны быць добрыя спецыялісты, рабочыя. А гэта вынік сумеснай работы: касцёла, царквы, сельвыканкама, сельгасарганізацыі. Да таго, як гаспадарку ўзначаліў Віталь Кушнер, тут кралі свіней з фермы. Дырэктар сам вымушаны быў лавіць злодзеяў. А цяпер наладжана дысцыпліна. Людзі давяраюць адзін аднаму. Нават дзверы ў сваіх дамах не зачыняюць на замок. Як раней, уткнуў у дзверы палачку ды і пайшоў па сваіх справах.

У Налібаках жывуць людзі светлыя душой і думкамі. Адпаведна і вёску, свае падворкі ўтрымліваюць у чысціні. У Мар'яна Карлавіча ў населеных пунктах ёсць давераныя асобы, якія арганізоўваюць жыхароў на добрыя справы. Ён і сам заклікае вернікаў выйсці на добраўпарадкаванне. І людзі адгукаюцца.

Доўгі час стары пагост быў закінутым...

Асаблівая ўвага надаецца могілкам, якія знаходзяцца каля касцёла. Тут пахаваны і католікі, і праваслаўныя. Ёсць пахаванні 1850 — 1860 гадоў. Доўгі час стары пагост быў закінутым, пакуль за справу не ўзяўся Мар'ян Карлавіч. Ён расчышчае магілы, падымае пліты, якія з цягам часу літаральна ўраслі ў зямлю, рэстаўруе помнікі. Крыжы на іх, дарэчы, зроблены з мясцовага матэрыялу.

— Яшчэ з сярэдзіны XV стагоддзя ў рэгіёне спецыялізаваліся на здабычы і перапрацоўцы карысных выкапняў: балотнай жалезнай руды, гліны, кварцавага пяску, — адзначае Аркадзь Казякоўскі. — У Налібаках была створана першая мануфактура еўрапейскага тыпу. Шкляны посуд пастаўляўся да царскага двара, за мяжу. Ад будынка засталася толькі частка фундамента.

Адрадзіць вытворчасць марыць, дарэчы, старшыня сельвыканкама. А пакуль ён распрацаваў герб вёскі: на фоне жоўтага кварцавага пяску — бакал як напамін аб былой славе, на зялёным полі — галава лася як сімвал Налібоцкай пушчы, і першыя ўспаміны аб Налібаках — 1447 год. Гэты атрыбут выкарыстоўваецца падчас свят, урачыстых момантаў у жыцці вёскі.

— У Налібаках жыве 535 чалавек, абсалютная большасць з іх католікі, праваслаўных менш. У тым, што яны жывуць у ладзе і згодзе, вялікая заслуга Мар'яна Карлавіча, — кажа Аляксандр Пілінкевіч. — Царква з'явілася ў вёсцы 10 гадоў таму. Да гэтага многія з праваслаўных вернікаў наведвалі касцёл. І кожнага ён выслухоўваў, падтрымліваў.

— А ці лічыце вы, ураджэнец Польшчы, сябе жыхаром Налібакаў? — пацікавілася ў Мар'яна Шэршаня.

За яго адказаў старшыня сельскага Савета дэпутатаў:

— Аднойчы на Мар'яна Карлавіча напалі заезджыя злодзеі — думалі, што ў касе касцёла шмат ахвяраванняў. У мяне было такое адчуванне, што наш святар не захоча тут застацца. Але ж ён не спужаўся.

...З кожным годам вернікаў у Налібаках прыбаўляецца. Налета шмат хто перабіраецца з гарадоў на дачы. Сельскі Савет з дапамогай іншых арганізацый зносіць старыя дамы, а ўчасткі прадае ахвотным. Толькі сёлета людзі набылі пад дачы 28 надзелаў. Сапраўды, чыстую ваду і прадукты можна купіць у краме, а вось чыстае паветра нідзе не здабудзеш.

Калі ішла аптымізацыя колькасці сельсаветаў, стаяла пытанне аб далучэнні Налібацкага савета да суседняга Дзераўнянскага. Але ў гэтым выпадку атрымлівалася надта вялікая тэрыторыя, амаль ці не на палову раёна. Пасля адпаведнага аналізу адмовіліся ад задумы. Для людзей больш зручнасцяў. Ды і працаваць з імі значна лягчэй: і сельвыканкаму, і школе, і святарам.

— Усе пытанні вырашаюцца на месцы. Жыхары звяртаюцца са сваімі патрэбамі ў любы час, — рэзюмаваў Аляксандр Пілінкевіч.

lazovskaya@zviazda.by

Стаўбцоўскі раён.

НА ТРАКТАРЫ — ПА ВАЛГАГРАДСКАЙ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Самае крыўднае, што за сапсаваную дарогу з людзей яшчэ і грошы ўзялі. Яны былі ўпэўнены, што атрымаюць каналізацыю. Але яе няма па сённяшні дзень.

— Я асабіста звяртаўся на прыём ва УКП да намесніка генеральнага дырэктара, пытаўся, чаму яны не прасачылі, як фірма праводзіла работы, — кажа Віталь Гардзееў. — Яны абяцалі прыняць меры. Але ўсё засталося ў падвешаным стане. У афіцыйным адказе напісалі: «праезд забяспечаны». Што мелася на ўвазе — незразумела. Бо праехаць па нашых дарогах можна толькі на трактары.

Каментарый па тэме

Генеральны дырэктар Магілёўскага гарадскога УКП Андрэй КІБЛОЎ:

— Комплексным планам добраўпарадкавання на 2016 год была прадугледжана падсыпка шэрагу вуліц асфальтагранулятам. Але гэта планавалася зрабіць у выпадку рэканструкцыі Мінскай шашы. Менавіта зняты з гэтай дарогі асфальт планавалася выкарыстаць для падсыпкі Валгаградскай і іншых вуліц. Рэканструкцыя гэтага аб'екта пакуль не праводзілася, таму і падсыпка вуліцы Валгаградскай не адбылася. Дарожна-маставое прадпрыемства вымушана было зрабіць падсыпку пяском і прафілёўку.

Андрэй Кіблоў таксама абнадзеіў, што хутка павінна пачацца фрэзераванне Мінскай шашы і будзе зроблена падсыпка некалькіх ям на вуліцы Валгаградскай. «Каб зрабіць падсыпку на шырыню вуліцы, асфальтагранулята недастаткова», — удакладніў ён.

Ён таксама паабяцаў, што па вуліцы Краснадарскай будуць прыняты меры.

— Мы накіравалі ліст у фірму ВЭКОГазГруп з патрабаваннем прывесці ў адпаведнасць месца раскопак, — паведаміў Андрэй Кіблоў. — Калі гэта не будзе зроблена, фірма можа пазбавіцца дазволу на раскопкі, пакуль не ліквідуе недахопы.



Депутату городского совета Пашкевич А.А.

Коллективное обращение.

...ный Александр Алексеевич! Уличный комитет и жители улицы ...ской Краснодарской обращаются к Вам оказать содействие по ...ранению давно устаревших деревянных столбов уличного освещения. ...ольшинство из них находится в аварийном состоянии и давно требуют ...ены.

Так же убедительно просим Вашей помощи по организации ...кущего ремонта пешеходной дорожки по ул.Волгоградской, т.к. она ...рактически отсутствует, а дорога по ул.Волгоградской находится в ...ачевном состоянии. Людям приходится идти по этой «дороге», дабы ее ...ирину с автомобилями, что создаёт опасность, как для пешеходов, так и ...я водителей. А из-за отсутствия твёрдого покрытия, как на проезжей части, ...к и на пешеходной дорожке практически не возможно пройти: лужи и грязь ...сле дождя или талого снега – обычная картина для этой улицы.

Уличный комитет №5
Председатель: Гордеев В.Ф.
Ул. Краснодарская, 11
тел. 71-75-75, +375-25-617-00-01

...ены уличного комитета:

Михнов Ю.С.
Суслова Н.В.
Такун В.С.
Панцакова И.Н.
Воднева Т.Н.

...одписи жителей:

У скаргах жыхароў — ніякіх перабольшванняў.

На жаль, нічога новага з гэтых адказаў для жыхароў не прагучала. Бо калі паявіцца гэты вельмі дэфіцытны асфальтагранулят, не ведае дакладна нават галоўны кіраўнік гарадской камунальнай службы.

Фота аўтара і з архіва Віталя ГАРДЗЕЕВА.

НА ПРЫЗБЕ

Бабуля з Вішні

Карэспандэнт «МС» пабываў у гасцях у адзінай жыхаркі вёскі з прыгожай назвай Вішня. Яна пражыла тут усё жыццё. Бабуля Ганна трымае шэсць коз і курэй. Сама выпякае хлеб па рэцэпце сваіх продкаў і ўмее рабіць традыцыйны беларускі сыр. Сцвярджае, што дзякуючы сваякам і мясцовай уладзе ні ў чым не мае патрэбы.

І нарадзілася тут

Вёска Вішня знаходзіцца каля лесу, ад якога недалёка да балота — аднаго з самых унікальных у Еўропе. Вішня — адзіная вёска на тэрыторыі Обальскага сельсавета, дзе пражывае ўсяго адзін чалавек.

Ганна Сяргееўна Штукіна, бабуля Ганна, просіць сабе не называць па бацьку. Нарадзілася яна 1 ліпеня 1928 года ў гэтай жа вёсцы. Родны дом цудам захаваўся. (Яго пабудаваў яшчэ яе дзед!) І знаходзіцца ён побач з тым, дзе яна жыве цяпер. Цікава, што ў якасці фундамента старога дома выкарысталі пні. Побач — стары калодзеж. Праўда, ваду бабуля бярэ з іншага. Рарытэтныя жорны і ступу выкарыстоўвае, каб зрабіць хлеб.

Ёсць у яе і лазня. Бабуля з болем расказала пра тое, што бацьку і трох яго братоў раскулачылі. І толькі за тое, што мелі добрыя гаспадаркі.



Бабуля Ганна.

Да вайны, паводле яе слоў, побач з вёскай была вузкакалейная чыгунка. Яе выкарыстоўвалі, каб перавозіць каштоўны торф у іншую вёску для перапрацоўкі.

І пра вайну ўспамінала. Лютавалі, кажа, паліцаі: забіралі ўсё, што на вочы трапіць, нават дзверы здымалі. Вельмі здзівіла расказам: пасля вайны тутэйшыя выкарыстоўвалі парашок з патронаў для ракетніц, каб... фарбаваць тканіны. Рабілі гэта ў балоце. А старэйшаму сыну шыла рубашкі з мешкавіны. (У ёй выдавалі мужчынам узрыўчатку, каб лёд узрывалі.)

Муж яе партызаніў. Пасля перамогі над фашыстамі працаваў у сельсавеце. Чалавек быў з «залатымі рукамі». Памёр гадоў дзесяць таму. Ганна Сяргееўна была рабочай на льняным маленькім прадпрыемстве, даяркай, свінаркай.

З мужам жылі параўнальна багата: каня трымалі, карову. І пчалярствам займаліся. Дамкі пчаліныя і цяпер можна ўбачыць.

Ёсць і газ, і тэлефон...

Не без гонару бабуля Ганна расказала, што ў яе доме ёсць усё, што трэба для жыцця.

— Калі што трэба, тэлефаную ў сельсавет. Старшыня вельмі добры і адносіцца да мяне з павагай. І старшыня райвыканкама прыязджаў. Дык да мяне — адной — аўталаўка прыязджае. Мне соромна, што хацелі аж 2 разы на тыдзень ездзіць. Сышліся, што хопіць і разу, — кажа пенсіянерка.

З цеплынёй гаворыць пра сыноў-пенсіянераў. Адзін прыязджае з Полацка, другі — жыхар Наваполацка. І ўнукі не забываюць...

— Вы ж бачыце, колькі дроў насеклі! Мне гэтага на некалькі гадоў хопіць. Але кожны пакалоць хоча *(усміхаецца)*. І міліцыянер заходзіць. А галасую на выбарах тут, дома. Калі дрэнна стане, дык «хуткую» выклікаю. Але асабліва на здароўе не скарджуся, — працягвае бабуля Ганна.

Адказная за святло

У Обальскім сельскім Савеце канстатуюць, што Вішня — адзіная сярод 39 населеных пунктаў вёска, дзе жыве адзін жыхар.

— Але ёсць тры вёскі, дзе толькі дачнікі жывуць. Ганна Сяргееўна — чалавек адказны. Напрыклад, мы яе навучылі, як уключаць і выключаць вулічнае асвятленне, і яна ў нас «адказная за святло». Перайзджаць нікуды не хоча, хоць пры мне сыны некалькі разоў яе запрашалі ў свае кватэры, — расказвае **Мікалай БУДНЕВІЧ, старшыня Обальскага сельскага Савета**.

Для таго, каб у Вішню маглі прыязджаць аўталаўка, міліцыя і гэтак далей, улада сочыць за станам дарогі. Гравійная, але ў добрым стане. І рамантуюць, і ад снегу чысцяць. Да суседняй вёскі кіламетры чатыры. І хай грошы выдаткоўваюцца для зручнасці аднаго чалавека, але ён таксама мае права на ўсе выгоды цывілізацыі.

Такіх, як бабуля Ганна, можна назваць сапраўднымі патрыётамі сваіх малой і вялікай Радзімы.

Слухаць яе расказы пра балота, лес, сустрэчы з мядзведзямі іншымі ляснымі жыхарамі — вялікае задавальненне. Але прызналася, што адна ў лес ужо не ходзіць. Хоць памятае ўсе грыбныя і ягадныя месцы. І на балоце, калі трэба, сарыентуецца, як у роднай вёсцы.

Таму і не дзіўна, што прыезджыя пасля знаёмства з бабуляй з павагай называюць яе «захавальніцай балота».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

pukshanski@zviazda.by

Шумілінскі раён.

ЗАМЕСТ КАЗАРМЫ І АНГАРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Столінскага раённага Савета дэпутатаў Аляксей ДЗЯМКО сказаў, што якраз у Давыд-Гарадку мы маем прыклад, калі з былымі ваеннымі пабудовамі абышліся па-гаспадарску. Нешта ўжо прададзена прадпрымальнікам і выкарыстоўваецца пад вытворча-складскія патрэбы, іншыя пабудовы закансерваваныя. Напрыклад, будынак былога штаба часці прайшоў стадыю кансервацыі і чакае сваёй чаргі на рэканструкцыю.

Але ж галоўнае, што хацелі паказаць удзельнікам сесіі гаспадары — новы дзіцячы садок. Дашкольная ўстанова з'явілася на месцы казармы і сталовай вайсковай часці пасля іх рэканструкцыі, рамонту і перааснашчэння. Грошы на такія патрэбы для Давыд-Гарадка былі выдзелены з бюджэту краіны па праграме развіцця Палесся. І вось зусім нядаўна малых наведвальнікаў сустрэў па сутнасці новы сучасны дзіцячы садок на 100 месцаў. Усё неабходнае для выхавання і развіцця малых тут ёсць. А ўдзельнікі сесіі, прымеркаваўшы свой візіт да нядаўняга навасялля, падарылі ўстанове камп'ютар, газонакасілку і мэблю.

Дзіцячая ўстанова ўсім спадабалася. Паводле ацэнкі Аляксея Дзямко, аднапавярховы будынак дашкольнай установы па шэрагу паказчыкаў пераўзыходзіць двухпавярховыя, што ўзводзяцца па тыпавых праектах. І выхавацелі, і бацькі выхаванцаў вельмі задаволеныя новым аб'ектам.

На прыватным прадпрыемстве «Полесские пряности» удзельнікі выязнога пасяджэння пазнаёміліся з варыянтам выкарыстання былой камунальнай маёмасці пад вытворчасць. Будынак прадпрыемства меліярацыйных сетак быў прададзены на аўкцыёне. Прадпрымальнік Сяргей Быба пераабсталяваў яго пад прадпрыемства для перапрацоўкі, захавання і рэалізацыі агародніны і садавіны. Прадукцыя, якую вырошчваюць на Століншчыне, прадаецца ў розных гарадах, у тым ліку ў абласным цэнтры. З развіццём вытворчасці на ўказаным прадпрыемстве створаны 22 рабочыя месцы.

На пленарным пасяджэнні сесіі **старшыня аблсавета Сяргей АШМЯНЦАЎ** адзначыў, што Століншчына як самы аддалены ад абласнога цэнтра рэгіён была выбрана для выязнога форуму невыпадкова. Адна справа, як уцягваюцца ў абарот памяшканні, якія пустуюць, у суседніх з Брэстам рэгіёнах, дзе развіты бізнес, і зусім іншая — рабіць гэту справу ў глыбінцы. Аб'екты, якія наведалі ўдзельнікі сесіі, сталі пацвярджэннем таму, што ў раёне назапашаны свой станоўчы вопыт на гэтым шляху. І работу трэба працягваць, бо ўсяго па раёне налічваецца 132 аб'екты, якія пакуль не выкарыстоўваюцца.

У дакладзе прагучалі лічбы, якія характарызуюць становішча спраў у цэлым па вобласці. Так, на Брэстчыне зафіксавана 2111 аб'ектаў усіх формаў уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца. А гэта 1366 тысяч квадратных метраў пустуючых будынкаў, якія маглі б прыносіць карысць.

Сяргей Ашмянцаў засяродзіў увагу менавіта на актуальнасці гэтай работы цяпер. Аднавіць падобны аб'ект, прыцягнуць яго ў гаспадарчы абарот абавязкова азначае стварыць новыя рабочыя месцы. І людзі ў канкрэтным рэгіёне, і дзяржава ў цэлым выйграюць ад таго, што новае жыццё атрымаюць былая казарма, сельскі клуб альбо калгасная ферма.

yackevich@zviazda.by

Столінскі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2016 года.